Беларускі шлях

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. насьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя накідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 57. Менск. Нядзеля 2 чэрвеня 1918 г. Год I

Абвесткі.

Кафэ Мордуха Мэтора (Губэрнаторская 17) будзе наперад да адмены адчынено што дня.

Менск 31/V 1918 г.

Нямецкі Граданачальнік
ГЕРШЭЛЬ.

Мэдыцынскі Аддзел Местовай Управы запрашае дохтара дзеля кіравання Мэдыцынскім Бюро, каторы павінен мець доугую практыку, як знаток санітарыі і гігіены, а так сама як вопытны рукавадзіцель дзела Грамадзянскай Мэдыцыны.

Менск 2/6.

Натуральна, што Беларусь на якой ад пачатку 50-х гадоу велася самая заузятая русіфікатарская палітыка, а перад гэтым переразпаушая усе прыемнасьці больш як двухвекавой прымусовай полонізацыі, пазбауленая свае дзержаунай візалежнасьці, да пачатку вялікай эуропэйскай вайны налічвала у сабе ні мала адзінак, якія інтарэсы свайго краю і народу саусім зьлівалі з інтарэсамі Імпэрыі і на усе глядзелі вочамі палітыкау Вялікарасіі.

Гэты вякіка-рускі патрыотызм вырабіу у іх спэцыяльную блізарукасьць, што да інтарэсау свае бацькаушчыны і зрабіу іх ніздольнымі бачыць, што для яе карысна, а што не.

Вайна і рэвалюцыя, па праудзі навучыла шмат каго з іх угллядацца на справы другімі вачыма, але ні усіх. Есьць ні мала інчэ сярод іх людзей, якія верацъ на слова у тыя аблуды, што падсоуваліся ім расійскімі, злашча лібэральнымі палітыкамі.

Такою аблудаю, шкодліваю для інтарэсау Беларусі, зьяуляецца вера у нейкі асобны дзержауны ідэалізм і вольналюбства дзержавау коаліцыі—Англіі і Францыі. Вера гэтая трымаецца прауда ні толькі у нікаторых з нашых горо-палітыкау,—яна лашчыць сэрцы і такіх жа легкаверау другіх, слабых народау—напр. палякоу.

Кенска разумеючи мову дыпломатау, яны западта вялікую вагу прыдаюць тым абецанкам якія у пачатку вайны зрабілі для малых народау гэтыя дзержавы. Ні памагае нават палітычная гісторыя бліжэйшаго да нас, XIX веку, якая сьведчыць, што Англія і Францыя займаліся нівялікімі народамі «постольку—поскольку»—на-колькі ім гэта было трэба і карысна, пільнуючы сваіх рэяльных інтарэсау, а ні чыейсь там волі і чыйгось дабра.

Калі аб малых народах гаворуць людзі, што прэдстауляли сабе бытцам каля каждай хаты у Рассі расьцець «развесістая клюква», то іх словы трэба умела расшыфроуваць.

«Малымі народамі» конкрэтна зьяуляюцца для іх тыя—што ужо маюць, альбо мелі дзержаунасьць. Сэрбія, Болгарыя, Румынія—Балканскія народы,—гэта «малыя народы» хаця у сваім часе ніхто другі як Англія стараўся нідапусьціць іх да гэтаго звання, быу процi іх нізалежнасьці. Бэльгія—гэта «малы народ», бо ен патрэбен як буффэр. Польшча—гэто «малы народ», каб стварыць прыгрозу на рубяжох аслабленых Нямеччыны і Аустрыі, тым болей, што аб тым як яго ад пачатку і да сярэдзіны XIX в. вадзілі на вяровацэ улудау тые-ж Францыя і Англія, можна прачытаць у падручніках па гісторыі. А Беларусь, Літва, Курляндзія, Эстляндзія, Ліфляндзія, Украіна і нілічапая колькасьць другіх народау якія у працягу XIX веку ні мелі дзержаунаго істнавання і жылі як этнографічная масса,—аб іх якая можа быць гутарка у асьвечаных марахоу і іх прыяцелеу. Хіба як аб «развесістай клюкве», чырвоны сок якой старанна і умела выціскалы «рускімі і (польскімі) гаспадарамі» можна будзе за сходную цану даставаць для ангельскіх цукерных фабрык і французкаго віннаго праізводства.

Лезунг «самаазначэння народау» выкінуты імі у сьвет, каб стварыць агульную прыхільнасьць да сябе і агульную ніпрыязнасьць для Нямеччыны, рэяльна меу значыць падзел народау згодна з выгадамі іх, ну і... Вялікаросіі, наскольки яе у гэтым ні удалося-б абыйсьці.

Хіба-ж маглі Францыя і Англія сэрьезна бажаць самаазначэння малых народау у Расіі і сэрьезна запатрабаваць гэтаго ад яе, бышай глаунай сілай коаліцыі, ад царскай Расіі, каторая хутчэй пакінула-б сваіх хаурусьнікау, чым згадзіцца на тукую прапазыцыю.

Аб гэтым ні варта нават і думаць,—так яна ясна.

Беларусь і усе народы заходу і поудзенна-заходу даунейшай расійскай імпэрыі, калі яны на праудзі хочуць каб аб іх як аб «малых народах» як аб «народах» нешта давеdaліся і загаварылі Францыя і Англія, павінны апірацца толькі на Нямеччыну, каторая ужо цяпер памагае ім заяуляць аб сабе як аб рэяльна істнуючых народах і, маючы канечне на увазе і свой уласны інтарэс, паможа ім стаць такавымі у міжнародным палітычным жыцці.

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

ПОЛЬСКАЯ ТЭОРЫЯ.

«Dziennik Wilenski» № 119 за 24 мая надрукавау артыкул: «Polskie Kościoly na Ukrainie.
«Zolnierz Polski» у Бабруйску надрукавау артыкул: «Zaścianki polskie na Bielarusi».

«Кожны кеп уласным строем»—
Гутарка гавора.
Дзеля гэтаго на сьвеці
Шмат бывае гора.
Усе на свой капыл зламаці,
—Што нібудзь, ды значыць.
Маюць храпку і палякі
Сьвет пераінaчыць.
На сталевых іх скрыжалях
Усе законы вечны,
Іх ад «honorowych» чуе
Устрэчны—папярэчны.
Арэндуець вернасьць Богу
«Narod» богамольскі:
Там, касьцел дзе каталіцкі,
Гэто,—«Kościól polski».
Там дзе шляхціц да халупы
Прыбудуе ганак,—
Гэто: «rdzennie polska ziemja»,
—«Polski to zascjanek»!
«Walzcyć z wrogiem, wsypać rózgi!»
—Іхнія законы.
Селянін наш будзе помніць
«Polskie legiony»!
Іх законы сьвет абхопяць,
Ото-ж «dobrże» будзе!..
Ад усходу да заходу,
Гэй, рыхтуйся, людзе!

З. Б.

Агульныя весткі.

БЭРН, 29/V. Сэнатцкая камісія у Мадрыдзе выдала рад пастановаў а змаганні з эпідэмыяй. Газэты выдаюцца у зьменьшаным формаце; ў Мадрыдзе захварэло 80,000 чалавек, у Барселоне 20—30 тысяч. Смертных выпадкаў пакуль што ні было. Прычына эпідэміі астаецца півядома.

МАЛЬМЭ, 29/V. З Масквы паведамляюць, што генэрал Мураёў, хутка пасьля назначэння яго глаўнокамандуючым каўказкай арміей быў арэштаваны за растрату рэспублiканскіх грошай. У зьвязі з растратамі Мураўёва арэштаваны так—сама генэралы Легрэв і Бэрзін.

РОТТЭРДАМ, 28/V. Як паведамляе амэрыканскі міністр юстыцыі, у Злучаных Штатах за першыя годы вайны было усяго 3,900 прыгавораў за выказыванне выразаў здраўства. 23 асобы асуджэны за кепскія выразы аб прэзыдэнці Вільсоне.

ЦУРЫХ, 28/V. Ваенныя крытыкі агулавой цурыхскай прэссы абсуждаюць новае нямецкае наступленне. Газэта «Цурыхэр Пост» піпіыць: з надзвычайным імпэтам армія Кронпрынца захапіла усю пазыцыю, кожны клок зямлі, каторай у ранейшых гадох абліваўся багата крывёй. Становішчо французаў вельмі сурьёзнае. Усе лівіі у цэнтры прарваны. На правым флангу англічане былі адсунуты назад. Іх войско акружано с трох старон. Як відаць, французы мелі вялікія страты. Раней усяго трэба лічыцца з вялікай стратай матэрыялу.

БЭРН, 28/V. Газэты пацьверджаюць асуджэние кіраўніка соцыялістаў, Фрыдрыха Крафта к 5 гадам турмы. Крафт, вядомы як соцыялістычны кандыдат штата Нью-Джэрсі, правініўся нібы то у падстрэкапельных выразах.

ЛЕНДАН, 28/V. Бонар-Лоу заявіў у палаце: «Ангельскі урад пачаў перагаворы дзеля апрацавання абшырнаго плану абмена палонных на кшталт нідаўняго франко-гэрманскаго сагласу».

ЖЭНЭВА, 28/V. Парыжскія газэты зьвертаюць увагу на тое, што дальнабойнае нямецкае арудзье, якому яны далі названне «гармата зданнё» або «тоўстая Бэрта», зноў апавешчало аб пачатку нямецкаго наступлення. Да вечара, як паведамляе «Пты Парызіен», 4 забітых і 20 раненых палі ахвярай поваго абстрэлу. Нота Гаваса паведамляе, што новы абстрэл ні быў раптоўным і што зноў заваеванная тэрыторыя карысна паслужыла новай устаноўцы арудзія. »Так як немцы», сказано у ноце, «маюць тэрыторыю паміж Сэн-Кантэнам і Нуайонам, то яны маглі лёгка знайсьці схаваны пункт». Арудзье падсунуто цяпер бліжэй да Парыжу, хаця яно знаходзіцца далека ад фронту, дзеля таго, што пастараліся паставіць яго за межамі сфэры абстрэла французкіх батарэй.

БУКАРЭСТ, 28/V. Італьянскі, бэльгійскі і сэрбскі паслы, якія знаходзяцца цяпер у Яссах, хадатайствовалі у румынскаго ураду аб звароту на бацькаўшчыну.

КІЕУ, 28/V. Ужо даўно у Кіеві удалося адчыніць абшырную прапаганду Згодітвo, сьляды каторай вялі да мейсцоваго грэцкаго консульства. З гэтай прычыны былі арэштаваны грэцкі ніштатны консул Грынора і грэцкі ніштат-

ны віцэ-консул Васіліады дзеля падазронств у шпігоўстве. Апозні па устаноўленні асобы пакуль быў адпушчэны на волю.

Рымскія газэты, упэўняны, што 12 чэрвеня адбудзецца скліканне абедзьвух палат, дзеля мэты прадаўжэння часоваго бюджэту да канца году і прэдостаўлення ураду поўнамоцтва дзеля здабывання надзвычайных грошай на выпадак, калі сьмета пяройдзе меру.

РОТТЭРДАМ. Ангельская газэта «Таймс» пішучы а баях ў Фляндрыі і Францыі так кажа: Найбліжэйшым бажаннем коаліцыйнай арміі ёсьць захопленне у сваю карысьць каменна-вугальных копей у Бэтюн. Страта гэтых копей азначае для Францыі страту 5 мільярдаў франкаў народнаго скарбу. Вуглі гэтыя могуць забезпечыць ўвесь край сваім ужываннем наймоней на чатыры тыдні.

ЛЕНДАН. «Морнінгпост» скардзіцца на атакі японскай прэсы на дзержавы антанты. Радыкальныя японскія газэты пішуць, што «антанта» становіча праціўіцца японскаму паходу на Сыбір, але гуфг гэты адбудзецца, калі гэтаго запатрабуюць жыццевыя інтарэсы Японіі.

РОТТЭРДАМ. Адсюль паведамляюць: У часе астатнай конфэрэнцыі коаліцыі у Парыжы і Абевіль прышлі да прызнання канечнасьці іщчэ аднэй зімняй кампаніі. Ізбрана камісія, пад вайсковым кіраўніцтвам, якая падаецца у Амэрыку, каб даведацца на сколькі можа памагчы Амэрыка сваім эўрапэйскім хаўруснікам, харчамі, войскам і амуніцыяй. Камісія ужо выехала.

Коваль.

Многа працы у мяне—
Хоць усю пору працуй!
Грэй жалезо у агне,
Вымай з горна і куй.

* * *

Молат важкі трымай
Пад кавадлам якраз,
З нізу у верх паднімай,
З верху у ніз раз у раз.

* * *

Адвярніся на сьпех,
Як сумееш урваць—
Ні забыцца, каб мех
У свой час паддуваць.

* * *

Адво іскры у бакі
І да верху лятуць,
Як паважна, з рукі
Малаты важка бьюць.

* * *

Раз другі і сашнік
Можа у поле ужо браць
Гарапашны мужык
Сваю ніуку араць.

* * *

Трэба шворан у воз—
Я згатую у сьлед;
Адбіць буксы калес—
І да гэтаго мэт.

* * *

Рукі знаюць настрой,
Молат услушан ка мне—
На усе жыцце цяжкой
Працы ховіць у мяне.

Ц. Гартны.

На беларускім шляху.

Першы склад Народнаго Сэкрэтарыяту функцыянуе і далей у поўным абьёме. Фарміраванне новаго складу (габінэту Скірмунта) зацягіваецца і разрэшыцца ні пазьней 10—15 чэрвеня. Р. А. Скірмунт атрымаў ад Народнаго Сэкрэтарыяту спэцыяльнае даручэнне і з надзвычайнымі поўнамоцтвамі выехаў за межы Беларусі.

— У зьвязі с пачаўшыміся мірнымі умовамі Украіны з Вялікаросіяй мае быць назначэнне новай мірнай дэлегацыі Народнаго Сэкрэтарыяту дзеля учасьця у гэтых умовах пры размежаванні Вялікаросіі з Беларусьсю.

— Член Беларускай Гандлёвай Палаты на Украіне дохтар М. В. Трэмповіч 29 мая назначаны Консулам Беларускай Народнай Рэспублікі у Кіеві. Да гэтаго назначэння абавязкі консулата выпаўняла Беларуская Гандлёвая Палата на Украіне.

— Народны Сэкрэтарыят асігнаваў на Беларускую гімназію у м. Будславе, Віленскай губ. 20000 руб. Гімназію гэту залажылі вядомыя беларускія дзеячы—І. Васілевіч і З Будзько, Пры той жа гімназіі арганізуецца беларускі коопэратыў.

— Пры Народным Сэкрэтарыяце Асьветы паднято пытанне аб залажэнні камісіі для перакладу папулярнейшых і карыснейшых школьных надручнікаў і кніжак для школ і народу. У хуткім часе будуць пераложаны лепшыя с пэдагогічнаго погляду кнігі для першых трох гадоў абучэння, а так сама папулярнейшыя выдавецтвы па сельскай гасцадарцы, лесаводству, філоводзтву, гаршэчнаго промыслу, эксплоатацыі пнёў, здабычы вапны, торфу і г. д.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Адход эшалона на Украіну, па загаду нямецкіх уласьцей, замест 31 мая, адбудзецца заутра 3 чэрвеня, а 6 гадз. рання, для запісаушыхся усіх украінскіх ваенных (афіцэрау, дохтароу, чыноунікау, салдат і сесьцер міласэрдзія).

Украінскі коопэратыу для украінцау якія астаюцца у Менску, уладжываецца пры тутэйшэй украінскай грамадзе. Патрэбныя прадукты будуць дастауляцца з Украіны.

Угалоуная сэсія акружнаго суда з учасьцем прысяжных заседацелеу закончылася учора. Большасьць спрау аб кражах. Лепшым па прамовам былі с тав., пракурора—Лукін, з абаронцау—прыс. павер. К. Петрусевіч.

Прэдстауніцтво інтарэсау па менням У. З. С. перайшоушым да губ. земскаго камітэта у мейсцовых складах, канфіскаваных нямецкімі уласьцямі ад дня окупацыі узложано нашым земствам на прысяж. павер. В. І. Чаусова.

Дэкрэтцыія прыбаукі і ліквідацыіонныя з Масквы ад рады народных камісарау даюцца мейсцовым жалезнякам, згодна нідауняму растлумачэнню, толькі запісаушымся па 16-е мая.

Дзело Глаубэрсона гласнаго несвіжской думы, прэдварыцельна пасаджанаго у турму за вядомую прамову у Менскай думе, будзе у хуткім часе за брак складу праступку спынено. Абаронцам па гэтай справе састаіць В. Чаусоу.

У еурэйскай абшчыне поунае сконструірованне і выбары пастаяннаго прэзыдума адбудуцца ні раней чым праз месяц. Увайшлі у абшчыну прэдстаунікі шэсьці фракцыяу — глаунае ад «Бунда» і сіаністау.

Згоды с апазыцыяй ад беспартыйнай группы, ні глядзя на усе старанні, ні было.

Ясное размежэванне сфэр абавязкау паміж членамі управы зробіцца гэтымі днямі новым меськім галавою С. Хржонстоускім.

Пшонную муку па 5 ф. на душу адпускае Л.-Р. жалезнякам харчавое коапэратыунае бюро пры упрауленні дарогі.

Мешчанская управа, ніахвотна канчаючы сваю ліквідацыю дзеля злучэння да грамадзянскаго аддзелу меськаго самоупраулення, сваім малопрацаздольньм выбарным пэрсоналам ні увайдзе у управу нават часьцічна.

Пытанне аб вольнанаемны служачых мешч. управы разрэшыцца на будучым тыдні; яны, мабыць, увойдуць усе у меськ. управу.

Сярод арэндатароу на землях памешчыка Ваньковіча пануе ніспакой с прычыны маючаго быць налічэння пені за запушчэнную за час вайны арэндную недаімку, а так—сама „прэкта паднядь чыкшэвыя стаукі для тых, якія узабнауляюць дагаворы.

Аддзелам харчоу пры градоначальстве прыймаюцца срочныя меры дзеля павялічэння дзеннай выпечкі, бо за апошнія 4 дні у большасьці бонавых крам ні хапало хлеба.

У міліцыі мейсцы камісарау 2 і 3 вучасткау маюць быць заменяны у хуткім часе новымі (пастаяннымі) болей адпаведаючымі свайму назначэнню асобамі.

Адьезд у Маскву у цэнтр К-т У. З. С. б. служачых па ліквідацыйныя апошнімі днямі прыняу характар стрэміцельнай «цягі».

— Забалеванне на тыфус і дэзынтэрыю сярод насялення у районе 3-й і 2-ой часьці места, як паведамляе меські мэдыцынскі аддзел, апошнімі днямі зьменьшылася да мінімума.

Віды на ураджай, па весткам губ. зем. управы, ні гледзючы на нідауні дождж, маюць быць ні вельмі важныя.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоуна[го] камандавання за 31 мая 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяў Прынца Рупрэхта:

Артылерыйскія бае зьменьваючайся моцы, нізначныя п[я]хотныя бае.

Група арміяў Нямецкаго Кронпрынца:

Мы перайшлі Уазу і Эйлет і, напіраючы на адступа[ю]чаго каля Эйлет ніпрыяцеля занялі лінію Брэціньі - С[т]. Потролі—Луар. Паўночней Энь мы адкінулі ніпрыяцеля [на] лінію Бьексі—Шавіньі. Паўднёвей Суассона французы ве[лі] контр-атакі пяхоты і кавалерыі, яны былі адбіты наш[ым] касуючым агнем.

Мы перайшлі дарогу Суассон—Арценнь. Французк[ія] дывізыі, пасьпяшаўшыя на падмогу ў напрамку на Ферэ-а[н]-Тардзенуа, паўднева-захадней Марны і с. поўдня-ўсходу [...] дзе ні маглі, ніглядзючы на адважныя контр-атакі, выказа[ць] удалае спраціўленне нашым удачліва пасоўваючымся корпу[]сом. Тыльныя пазыцыі ніпрыяцеля каля Арсі і Гран-Розу былі перарваны. Паўднёвей Ферэ-ан-Тардзенуа, мы дасягну[лі] Марны. Узвышша каля Шанповізі, Ст.-Жэмм і Рэпіньі зна[]ходзяцца ў нашых руках; на паўднёвым беразі р. Вэль за[]хадней Рэймсу быў забраны Жэрміньі.

Лічба палонных і здабытак ўвесь час падвышаюцца— болей як 45,000 палонных, шмат больш як 400 пушкаў тысячы кулямётаў.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Выдачу наградных, у гэтым годзе на Вялікдзень ні адпушчаных дзеля браку грошай, новы меські галава абецауся адпусьціць усім служачым управы і сіроцкаго суду у бліжайшыя дні.

Хлебны паек ад заутрашняго дня, 3 чэрвеня, зноу паменьшаецца ад $2\frac{1}{2}$ ф. на —2 фунты на порцыю.

Весткі с краю.

м. Радашковічы, Віленскай губ. Вілейскаго пав.

Тэатральная выстава 19 маю г. г.

(ад нашаго дапішчыка).

Што да беларускаго тэатру —Радашковічы маюць сваю гісторыю і пэўную заслугу, У 1894 року, калі ішчэ беларускі рух мала каму быў у галаве, гурток інтэлігэнтаў м. Радашковічы і яго аколіц ладзіў платную маёўку, даход с каторай маніўся пайсьці на аснову шпіталю ў Радашковічах. Маёўка ладзілася на вялікую скалю: білеты разсыпаліся ні у адзін павет і губэрню, а нат у сталіцы. Вялізарнае памешканне—дом на два паверхі даў пад гэту маёўку п. Багдановіч у сваім двары—Бакштах (вёрст 5 ад Радашковіч).

Ось, на гэтай маёўцы—вечарынцы і меў углядзіць з,ехаўшыйся з усіх старон народ першае прэдстаўленне на беларускай мове. Іграць маніліся камэдыю «Злодзей», напісанную Ядвігіным Ш. ішчэ у 1890 г., рэч гэта, ні зважаючы на стараньне сэкрэтара маскоўскаго этнаграфічнаго імпэратарск. т-ва—Янчука, цэнзуры ні прайшла, але арганізатары вечарыны спадзеваліся правесьці гэту справу ціхенька, спадзеваліся на ўдачу тым больш, што нікаторыя ролі гралі такія асобы, як мейсцовы судзебны следавацель і інш., с каторымі ў тыя час[ы] ні толькі мейсцовая, але і па[]ветовая паліцыя задзірацца ба[]ялася. Што будзе пасьля, [як] даведаецца губэрнатар, — па[]рахубу ні бралося: неяк зам[]жыцца і ўсё.

Ужо ролі выучыліся, ўжо рэпэтыцыі ішлі добра, назна[]чана ўрэшці была на некольк[і] дзён перад маёўкай і ге[]нэральная рэпэтыцыя, калі ні[]ўспадзеўкі нібыто на абед— у госьці да сьледавацеля пры[]ехаў с паватовай Вілейкі пра[]курор. Пасьля абеду—пры кі[]лішку віна—ён нізначна за[]вёў гутарку аб будучай веча[]рынцы і тэатры і нібыто з вя[]лікае прыязьні даў дэлікатн[а] зразумець, што прэдстаўленн[е] на беларускай мове, ды ішч[э] ніцанзурнае, можа нарабіц[ь] шмат клопату: паліцыя, баю[]чыся сама выступіць, напэўн[а] дала ўжо куды трэба данос[,] на маёўку могуць зьявіцц[а] жандары і нарабіць усялякі[х] ніпраемнасьцяў, рэзультаты ка[]торых трудна цяпер і згадаць.

Пасьля такой гутаркі ясна стала, што трэба было іьсць на рызыку, але на гэта ні ўсе маглі і хацелі адважыцца. Маёўка-вечарынка адбылася шумна, вясёла, бо сапраўды народу наехало адусюль гібель, але прэдстаўлення на беларускай мові ні было, і гэткім чынам першая проба ў гэтым напрамку ніудалася.

Праз гадоў дзесяць пасьля гэтаго, але ўсё ж такі Радашковічам выпало на долю першым паставіць беларускае прэдстаўленне. Арганізавалі яго А. Уласоў са сваім братам. Прэдстаўленне было вельмі ўдалое і зрабіло гады вялікае ўражэнне.

Н.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грыйблята.